Начало XXI века лишь подтвердило жизнестойкость традиций сюрреализма в белорусской графике. Иррациональность как незаменимая часть художественного произведения получает новые и новые трактовки. Это демонстрируют работы Р. Сустова, А. Слободчиковой, А. Родина, С. Тимохова, В. Швайбы, Ю. Подолиной, Т. Лариной, А. Тихоновой, В. Васюка, А. Зинкевича, А. Забавчика, В. Рачковского и многих других молодых авторов. Обращенное к постмодернистскому дискурсу, современное белорусское искусство демонстрирует стремление быть включенным в глобальный культурный процесс.

Вместе с тем, одна из актуальных проблем, которая всегда волновала белорусских искусствоведов, связана с сохранением целостности отечественной культуры. Однако признать значение постсюрреализма совсем не означает осознать тот факт, что не было единой и общей истории белорусского искусства конца XX – начала XXI веков. Скорее наоборот – это путь, способный помочь создать подлинную историю отечественного искусства, в которой найдется место для всего многообразия ее проявлений.


1. *Олива, А. Б.* Искусство на исходе второго тысячелетия / А. Б. Олива. – М.: Художественный журнал, 2003. – 218 с.

2. *Эпштейн, М. Н.* Постмодерн в России. Литература и теория / М. Н. Эпштейн. – М.: Изд. Р. Элинина, 2000. – 368 с.

3. *Цыбульскі, М.* Магнітнае поле сюррэалізму / М. Цыбульскі // Мастацтва. – 1999. – № 12. – С. 31.

4. *Бореев, Ю.* Эстетика: в 2 т. / Ю. Бореев. – Смоленск: Русич, 1997. – Т. 2. – С. 361.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


*А. У. Сцяпанаў, аспірант*
*БДУ культуры і мастацтваў.*
*Навуковы кіраўнік – М. А. Бяспалая,*
*доктар гістарычных навук, прафесар*


## ПРАЦЭС РЭСТЫТУЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ

Праблема рэстытуцыі культурных каштоўнасцей у большай ці меньшай ступені з'яўляецца актуальнай праблемай для многіх краін. Для Беларусі яе актуальнасць абумоўлена неабходнасцю вяртання ў краіну страчаных у розны час і па роз-

ных прычынах значнай колькасці культурных каштоўнасцей – ад старадрукаў і архіўных дакументаў, да твораў мастацтва і рарытэтных музейных прадметаў.

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны”, гісторыка-культурныя каштоўнасці – матэрыяльныя аб’екты (матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці) і нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека (нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці), якія маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Гісторыка-культурныя каштоўнасці валодаюць прыкметамі ўнікальнасці, эталоннасці, тым самым з’яўляюцца сведчаннем багатага духоўнага развіцця кожнага народа і яго своеасаблівай гістарычнай памяццю. Адрыў культурных каштоўнасцей ад сваіх нацыянальных каранёў – гэта цяжкі удар па культуры.

Што разумее сучасная сусветная супольнасць пад рэстытуцыяй гісторыка-культурных каштоўнасцей? З пункту погляду гістарычнай навукі – гэта від матэрыяльнай адказнасці дзяржавы, што здзейсніла ваенную агрэсію, якая заключаецца ў змяншэнні, поўнай або частковай кампенсацыі нанесенай шкоды шляхам аднаўлення першапачатковага стану, у прыватнасці, вяртання нарабаваных каштоўнасцей [3, с. 430]. З пазіцыі этымалогіі, тэрмін “рэстытуцыя” паходзіць ад лацінскага “restitution”, што азначае аднаўленне [3, с. 430]. Пытанні рэстытуцыі ўзнікаюць у сувязі з войнамі, зменамі дзяржаўных межаў, пры атрыманні незалежнасці пэўнымі тэрыторыямі і народамі і інш. Аб’ектамі рэстытуцыі найчасцей выступаюць культурныя каштоўнасці – рухомая і нерухомая маёмасць, якая мае вялікае значэнне для культурнай спадчыны пэўнай дзяржавы [1, с. 230].

Пачатак даследавання праблем, звязаных з рэстытуцыяй гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі фактычна неабходна звязваць з перыядам, калі навуковымі коламі пачалі непасрэдна ставіцца задачы вяртання гэтых каштоўнасцей на нашы землі. Упершыню пытанне пра вяртанне нацыянальных культурных (у прыватнасці архіўных) каштоўнасцей было пастаўлена на Першай Усебеларускай канферэнцыі архівістаў, якая праходзіла ў Мінску 12–14 мая 1924 г. (дакладчыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У. Краснянскі, У. Пічэта, З. Жылуновіч). На канферэнцыі былі разгледжаны пытанні вывезеных архіваў, якія паходзілі з Беларусі ці мелі да яе непасрэднае дачыненне (мінскія, віленскія архівы, Метрыка ВКЛ і інш.). Былі прыняты рэзалюцыі, якія ставілі задачу забеспячэння захаванасці наяўных і вяртання вывезеных архіўных збораў [1, с. 231].

17–18 студзеня 1926 года ў Мінску адбыўся Першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі. На ім былі заслуханы даклады пра Метрыку ВКЛ, пра іншыя беларускія архівы за межамі БССР, пра вываз каштоўных кніг з Беларусі і прыняты адпаведныя рэзалюцыі аб неабходнасці вяртання архіўных, бібліятэчных і музейных матэрыялаў.

Ужо ў 1920-я гг. у рэспубліку была вернута вялікая частка дакументаў былога Віцебскага архіва старадаўніх актавых кніг. Аналагічная частка матэрыялаў Міншчыны, Берасцейшчыны, Гарадзеншчыны, што захоўвалася ў Віленскім архіве, ужо значна пазней (у канцы 1939 – пачатку 1940) вярнулася ў беларускія сховішчы [1, с. 232].

У гэты час урадам БССР былі прынятыя вельмі сур'ёзныя спробы па вяртанню аднаго з найбольш вядомых і каштоўных прыватных кніжных збораў дарэвалюцыйнай Беларусі – бібліятэкі Я. Храптовіча XVIII ст., якая налічвала больш за 10 тысяч кніг і каля 150 копій рукапісных дакументаў. На жаль, гэтыя спробы не былі канчаткова рэалізаваны [1, с. 232–233].

Даволі актыўныя намаганні беларускіх навукоўцаў 1920-х гадоў па вяртанню вывезеных з Беларусі культурных багаццяў былі жорстка перарваны ў 1930-я гады. Як лічаць некаторыя даследчыкі, на гэтым рэстытуцыйная дзейнасць у БССР была спынена да канца 1980-х гадоў.

Тым не менш, на працягу 1940-80-х гадоў пошук згубленых і раскіданых па ўсім свеце унікальных культурных каштоўнасцей праводзілі супрацоўнікі Беларускага рэспубліканскага аддзялення Савецкага фонду культуры, Міністэрства культуры БССР, Акадэміі навук БССР, Галоўнага архіўнага ўпраўлення рэспублікі, Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна, Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі, кіраўнікамі і мастацтвазнаўцамі беларускіх музеяў.

Пасля распаду СССР пачаўся этап значных перамен у адносінах да нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны. Менавіта тады гісторыкі выступалі з найбольш смелымі

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гіпотэзамі. Былі апублікаваны сенсацыйныя дакументы, наладжваліся першыя міжнародныя канферэнцыі і круглыя сталы, у прыватнасці – з польскімі і літоўскімі калегамі, ствараліся супольныя камісіі для абмеркавання пытанняў гісторыка-культурнай спадчыны і магчымасцей яе рэстытуцыі.

Характэрнай асаблівасцю працэсаў пошуку, выяўлення, вяртання і сумеснага выкарыстання культурнай спадчыны ў Беларусі постсавецкага перыяду з'яўляецца іх грамадскі пачатак. На той момант у Беларусі не існавала дзяржаўнага або грамадскага органа па пытаннях рэстытуцыі. У 1987 годзе пры Беларускім фондзе культуры ўзнікла грамадская камісія "Вяртанне", якая дзейнічае і па сённяшні дзень. На грамадскіх пачатках яна стварае каталогі, спісы, вопісы страчаных гістарычных і мастацкіх рухомых каштоўнасцей. Пад агульнай назвай "Вяртанне" была выдадзена серыя кніг, у якую ўвайшлі гэтыя даследаванні. Дасягнуты значныя вынікі ў рэальным вяртанні культурных каштоўнасцей – вернута Слуцкае евангелле, навагрудская археалагічная калекцыя і г.д. На першапачатковым этапе немалаважнае значэнне мела стварэнне спіса вывезеных з Беларусі каштоўнасцей, які па выніках розных даследаванняў пастаянна абнаўляецца. Актывізацыі працэсу рэстытуцыі садзейнічала прыняцце шэрагу міжнародных дакументаў (рэзалюцыі і канвенцыі ААН і ЮНЕСКА, пагадненні дзяржаў-удзельніц СНД, двухбаковыя міждзяржаўныя дамовы. Дзякуючы грунтоўнай навуковай і пошукавай дзейнасці шэрагу сучасных дзеячаў культуры і навукі, сярод якіх І. Чыгрынаў, У. Гілеп, А Грыцкевіч, А. Мальдзіс, Т. Рошчына, М. Шумейка, М. Яніцкая, Н. Высоцкая, Л. Побаль, В. Скалабан і іншыя, праблема вяртання разрабаваных і незаконна вывезеных культурных помнікаў і рарытэтаў стала справай гонару, пытаннем часу і будучыні [2, с. 236].

Аднак, на жаль, застаецца нявырашанай праблема фінансавання праектаў вяртання, неабходным з'яўляецца стварэнне дзяржаўнага органа, які б займаўся каардынацыяй дзейнасці па рэстытуцыі культурных каштоўнасцей, якія належаць Рэспубліцы Беларусь.

---

1. *Несцярчук, Л. М.* Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л. М. Несцярчук. – Мінск, 2003. – 286 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Суша, А. А.* Міжнародная дзейнасць Беларусі па пытаннях рэстытуцыі культурнай спадчыны / А. А. Суша // Содружество наук. Барановичи-2005: материалы междунар. науч. конф. молодых исследователей, 22 февраля 2006 г., г. Барановичи, Беларусь: в 2 ч. / редкол.: В. И. Кучурко (главный редактор) [и др.]. – Барановичи, 2005. – Ч. 1. – С. 235–237.
3. *Шумейка, М.* Рэстытуцыя / М. Шумейка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2003. – Т. 6, кн. 2. – С. 430–431.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*О. В. Тарасевич, аспирант*
*БГУ культуры и искусств.*
*Научный руководитель – Г. Ф. Шауро,*
*доктор искусствоведения, профессор*

## ДЖАЗ В ЖИВОПИСИ АЛЕКСАНДРА ВОЛКОВА

Музыка – одна из популярнейших тем в изобразительном искусстве. Ее способность выражать то, что нельзя высказать словами, передавать нюансы малейших движений человеческой души, привлекала художников издавна. Джазовая музыка является, пожалуй, самой «чувствительной» и гибкой в этом отношении, т.к. импровизация – ее основа и отличительная черта, представляющая собой выражение внутреннего мира музыканта Она передает эти движения «без купюр». Эмоциональная заостренность, яркая выразительность, фонтанирующая радость жизни, необыкновенная откровенность – все это составляет уникальность и привлекательность джазовой музыки и представляет большой интерес для сообщества художников.

За последние годы значительно увеличился объем произведений изобразительного искусства джазовой тематики, представленных в интернет-галереях российскими художниками. Среди авторов: Вячеслав Куликов (р. 1939), Марина Подгаевская, Александр Рябичев (р. 1926), Александр Токарев (р. 1946), Алексей Ланцев (р. 1970), Иван Несветайло (р. 1959) и др. Связь работ этих художников с джазом не вызывает сомнений: изображены узнаваемые исполнители, характерный инструментарий, использованы соответствующие сюжеты и названия. Многие современные авторы называют свою живопись «джазовой», не имея в виду тему джаза в своих работах: «джаз» для них – это специфическое психоло-